# ФЕНОМЕН ВАЙНЫ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Феномен вайны працягвае заставацца адной з актуальных праблем сучаснага грамадства. Таму вырашэнне такіх фундаментальных пытанняў чалавечай існасці, як узаемаадносіны свабоды і абавязку, дабра і зла, выбару і адказнасці, і інш., немагчыма без глыбокага і ўсебаковага яго асэнсавання. Традыцыя даследавання дадзенага феномена пачала складвацца яшчэ ў антычны час. Так, Дэмакрыт з Абдэр адным з першых паставіў пытанне аб прычынах вайны, вылучыўшы сярод іх маёмасную няроўнасць людзей, а таксама самавольства прадстаўнікоў улады. Сакрат бачыў прычыну вайны ў недасканаласці людзей, іх няздольнасці ўнікнуць у змест такіх паняццяў, як «дабро» і «зло». Платон разглядаў вайну як састаўную частку «мастацтва палітычнага». Закранутыя вышэй меркаванні сведчаць аб тым, што вайна выступала для большасці антычных мысляроў з’явай, непарыўна звязанай са станам існасці грамадзян поліса, а таксама ўмовамі іх сацыяльнага жыцця.

У рэлігійна-філасофскіх творах А. Аўгусціна, Ф. Аквінскага і іншых аўтараў Сярэдневякоўя ўяўленні аб вайне фарміраваліся пад уплывам тэалагічных догматаў, якія вызначалі яе як бесперапынную барацьбу паміж сіламі дабра і зла, святла і цемры.

У працах еўрапейскіх ваенных тэарэтыкаў XIX ст. (К. Клаузевіц, Х. Мольтке, А. Шліфэн), якія набылі характар класічных, вайна стала трактавацца як феномен, непасрэдна звязаны з узброеным насіллем. «Вайна ўяўляе сабой працяг палітыкі пры дапамозе сродкаў насілля» (К. Клаузевіц). Таму сутнасць вайны бачылася ў фокусе двух асноўных элементаў – палітыкі і ўзброенай барацьбы. Разам з тым мацавалася разуменне таго, што «войны пачынаюць не каралі, а біржы» (Х. Мольтке). У цэлым з пункту гледжання нямецкіх тэарэтыкаў не выклікала ніякага сумнення думка аб тым, што «вайна ёсць сутыкненне буйных інтарэсаў, якое вырашаецца праліццём крыві, і толькі гэтым яна адрозніваецца ад іншых грамадскіх канфліктаў» [3, с. 163].

Прадстаўнікі псіхалагічнага падыходу крыніцу войн звязвалі з псіхічным станам людзей. Так, З. Фрэйд лічыў, што ў чалавеку закладзена імкненне да самаразбурэння, якое ён назваў інстынктам смерці («танатас»). Дадзены дэструктыўны інстынкт, паводле аўтара, можа раз-пораз знянацку ўрывацца ў грамадскія працэсы, выклікаючы розныя канфлікты і сутыкненні, у тым ліку ваенныя.

Ідэя З. Фрэйда атрымала працяг у працы аўстрыйскага даследчыка К. Лорэнца «Так званае зло: да натуральнай гісторыі агрэсіі» (1963), дзе ён сцвярджаў, што ў чалавеку, як і ў жывёл, агрэсія з'яўляецца прыроджанай рэакцыяй і мае сваю ўнутраную матывацыю. Эвалюцыя, лічыў вучоны, не змагла ці то не паспела даць чалавеку адпаведныя здольнасці, каб справіцца з ёю. Менавіта веданне таго факта, што агрэсія з'яўляецца сапраўдным інстынктам, накіраваным на захаванне віда, дазваляе нам зразумець, наколькі яна небяспечная. Галоўная ж небяспека гэтага інстынкту заключана ў яго спантанасці. Адсюль песімістычныя высновы аўтара: «Калі без захаплення паглядзець на чалавека, які ён сёння (у руках вадародная бомба, падарунак яго асабістага розуму, а ў душы інстынкт агрэсіі – спадчына чалавекападобных продкаў, з якой яго інстынкт не можа справіцца), цяжка прадказаць яму доўгае жыццё» [4, с. 25].

Свой погляд на вайну прапанавалі таксама прадстаўнікі сацыялагічнага падыходу, вядомым выразнікам якога быў французскі сацыёлаг і сацыяльны філосаф Р. Арон. Вайну ён лічыў натуральным станам грамадства, а мір – яе млявым працягам, толькі без непасрэднага прымянення ваеннай сілы. У працы «Мір і вайна паміж народамі» аўтар падкрэсліваў: «Вайна – гэта спецыфічная грамадская з'ява, якая ўзнікла, верагодна, у пэўны момант чалавечай гісторыі: яна ўяўляе сабой арганізацыю насільных дзеянняў згуртаваннямі людзей у стане супрацьстаяння» [1, с. 409].

У выніку заканчэння «халоднай вайны» народы праніклі́ся аптымістычнымі спадзяваннямі на тое, што знікненне біпалярнага супрацьстаяння ў свеце прывядзе да знікнення міжнародных канфліктаў. Гэта надзея знайшла сваё абгрунтаванне ў артыкуле Ф. Фукуямы «Канец гісторыі?» (1989). На думку амерыканскага аўтара, менавіта «рыначная дэмакратыя» заходняга тыпу ўвасобіла канчатковы ідэал грамадства, «абсалютную ідэю» міжнародных адносін [6]. Развіццё сусветных палітычных працэсаў ужо ў пачатку 1990-х гадоў абвергла дадзеныя мроі Фукуямы. Свет не толькі не стаў больш бяспечным і стабільным, але і заявіў аб сабе як непрадказальны, падвержаны пагрозам, сярод якіх асобнае месца займела нематываванае прымяненне ўзброенай сілы. На практыцы гэта вылілася ў аднабаковыя або кааліцыйныя аперацыі заходніх краін супраць сваіх палітычных і эканамічных апанентаў у гла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бальным маштабе. Першай такой акцыяй стала вайна ў Персідскім заліве. Яна даволі выразна прадэманстравала народам свету імкненне Захаду з дапамогай зброі сцвердзіць новыя прынцыпы арганізацыі міжнароднага супольніцтва.

Кардынальныя змены ваенна-палітычнай сітуацыі ў свеце ў канцы ХХ – пачатку XXI ст. запатрабавалі не толькі пераасэнсавання прыроды і сутнасці вайны, але таксама і сучасных узброеных канфліктаў. Менавіта ў гэты перыяд сталі ўзнікаць рознага кшталту канцэпцыі, аўтары якіх спрабавалі вызначыць патэнцыяльную канфліктнасць існуючага грамадства, абгрунтаваць неабходнасць і легітымнасць прымянення ўзброенай сілы ў інтарэсах той часткі міжнароднага супольніцтва, якая атаясамлівае сябе з амерыкана-заходнееўрапейскімі каштоўнасцямі. Да іх ліку належыць канцэпцыя «сутыкнення цывілізацый» С. Хатынгтона. У адпаведнасці з ёй на змену класічным канфліктам эпохі халоднай вайны павінны прыйсці канфлікты паміж культурамі. Заўважым, што канцэпцыя С. Хантынгтона супярэчыць поглядам Ф. Фукуямы, які схіляўся да таго, каб бачыць будучае больш аптымістычна.

Сёння на Захадзе даволі шырокае распаўсюджанне атрымліваюць розныя ваенна-тэарэтычныя канцэпцыі, у якіх падкрэсліваецца прыярытэтная роля высокіх тэхналогій. Імклівае развіццё апошніх, на думку прадстаўнікоў дадзенага напрамку, рэвалюцыянізуе ваенныя сродкі і тым самым вядзе да змены формаў вядзення вайны. Асаблівай увагі ў дадзенай сувязі заслугоўваюць погляды аднаго з найбольш значных сучасных тэарэтыкаў сацыяльнага лібералізму Э. Тофлера. У сваім творы «Вайна і антывайна: Што такое вайна і як з ёй змагацца. Як выжыць на парозе XXI стагоддзя» (1995) аўтар сцвярджае, што асноўных антаганістаў будзе падзяляць узровень тэхнічнага развіцця, а сацыяльныя, тэхнічныя і іншыя наступствы гэтага развіцця стануць у бліжэйшым будучым прычынамі войн паміж краінамі індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства. На думку аўтара, ужо сёння бачна ўзнікненне «на планеце новай цывілізацыі, з якой прыходзіць інтэнсіўнае выкарыстанне ведаў для стварэння багацця, гэта цывілізацыя падзяляе свет на тры часткі і пераўтварае ўсю глабальную сістэму» [5, с. 351].

Асаблівую ўвагу засяродзім на канцэпцыі Дж. Шарпа, за якім замацавалася назва ідэолага «негвалтоўнай барацьбы» і разбуральніка СССР. У кнізе «Ад дыктатуры да дэмакратыі. Стратэгія і тактыка вызвалення» (1993) такая барацьба разглядаецца як «культурна-камунікацыйная вайна», накіраваная на псіхалагічнае падаўленне праціўніка. Яе поспех, паводле Дж. Шарпа, абумоўлены палітычнымі тэхналогіямі, якія ўключаюць у свой арсенал «198 спосабаў негвалтоўнага пратэсту» [7]. Апошнія ўтрымліваюць шырокі набор канкрэтных методык: забастоўкі, сядзячыя пратэсты, «жывыя ланцугі» пратэстуючых ад горада да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

горада, блакіраванне адміністрацыйных будынкаў, байкот выбараў, галадоўкі і нават публічнае самаспаленне некаторых прадстаўнікоў апазіцыі, якія прыносяць сябе ў ахвяру дзеля дасягнення палітычнай мэты. Шматлікія сцэнарыі з дапамогай заходніх куратараў неаднаразова набывалі рэалізацыю ў ходзе так званых «аксамітных», «каляровых», «аранжавых» і іншых рэвалюцый у глабальным свеце, у тым ліку на постсавецкай прасторы.

Глабалізацыя актыўна садзейнічае пашырэнню новых формаў вайны. Сярод іх асобнае месца заняла вайна тэрарыстычная, у якой выкарыстоўваюцца такія «некласічныя» спосабы насілля, як палітычныя забойствы, захоп заложнікаў, знішчэнне міжнародных транспартных, а таксама інфармацыйных сістэм, разбурэнне сусветных помнікаў культуры (горад Пальміра ў Сірыі) і інш.

Узрастанне палітычнай напружанасці ў свеце суправаджаецца не толькі шматлікімі тэрарыстычнымі актамі, але і такімі формамі супрацьборства, якія набылі назву «гандлёвых войнаў», «кібервойнаў», «інфармацыйных войнаў», «гібрыдных войнаў» і г. д. Так, пастаянна нарастаючы дэфіцыт прыродных рэсурсаў, саперніцтва за валоданне імі, патрэбы ў таннай працоўнай сіле, а таксама ў новых рынках збыту тавараў прывялі да ўзнікнення сучасных «эканамічных войнаў», за якімі аналітыкі бачаць перадзел сфер уплыву на планеце. У дадзеным рэчышчы разгортваецца сёння жорсткае эканамічнае і ваенна-тэхнічнае супрацьстаянне Захаду з Кітаем і Расіяй.

Звычка да вайны стала адметнай характарыстыкай глабальнага супольніцтва. Вайна ў сучасным грамадстве не ахоплівае значную большасць краін, гэта значыць, пакуль не з’яўляецца татальнай, але мноства лакальных канфліктаў сведчаць аб перманентным характары вайны, аб пашырэнні яе дэструктыўнай функцыі і тым самым набліжэнні да глабальнай катастрофы.

Сярод шэрага прычын вайны сучасным аналітыкам па-ранейшаму неабходна вылучаць не толькі першапрычыны, але і падставы таго ці іншага ўзброенага канфлікту. Шматлікія факты таксама нагадваюць аб тым, што мноства канфліктаў можа быць выклікана пазарацыянальнымі прычынамі (штучна створаны і актыўна эксплуатуемы на Захадзе вобраз ворага (расійскіх хакераў-злаўмыснікаў), «чалавечы фактар» у пускавай шахце міжкантынентальных балістычных ракет ці то на борце атамахода ў глыбінях акіяна і г. д.

Галоўнае дасягненне глабалізацыі бачыцца яе адэптам у тым, што яна садзейнічае аб’яднанню сіл усяго чалавецтва супраць розных пагроз і выклікаў, такіх як хваробы, голад, войны і г. д. Тым не менш у наш час становіцца ўсё больш відавочным, што глабалізацыя не толькі не спраўляецца з рэальнымі пагрозамі чалавецтву, але і ўзмацняе іх. Сёння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пандэмія каронавіруса наглядна сведчыць аб тым, што авангард глабалізацыі – атлантычны Захад – не толькі аказаўся эгаістычна самазачыненым ад астатняга свету так званай «сцяной Трампа», але паставіў пад сумненне і сваю асабістую інтэграцыю. Адзначым таксама, што каронавірус «пагрозліва» нагадаў нам адзін з магчымых сцэнарыяў сусветнай вайны з прымяненнем біялагічнай зброі, як гэта бачылася заўзятарам мілітарызму ў часы супрацьстаяння дзвюх варожых блокаў – НАТА і Варшаўскай дамовы.

Выяўленне ўнутраных матываў вайны ў сучасным грамадстве, пагроза якой працягвае існаваць, патрабуе пільнага інтэрдысцыплінарнага падыходу з прыцягненем не толькі гістарычных ці паліталагічных дадзеных, але і філасофскіх, эканамічных, культуралагічных, сацыяльнапсіхалагічных і іншых даследаванняў. Так, сучасны расійскі навукоўца А. Г. Дугін у кнізе «Філасофія вайны» (2004) спрабуе прааналізаваць гэты феномен ва ўзаемасувязі экзістэнцыяльных, этычных, рэлігійных, містычных і нават эсхаталагічных сэнсаў, акцэнтуючы ўвагу на экзістэнцыяльнай традыцыі праваслаўя. Мэта вучонага – сфармуляваць новую дактрыну адэкватнага адказу «Аб'яднаных Сіл Еўразіі» на выклікі глабальнага свету [2].

Падзяляючы імкненне аўтара, падкрэслім, што эканамічнае, тэхнічнае і духоўнае развіццё краін СНД агульнымі сумеснымі намаганнямі павінна набыць той ўзровень, які надзейна дазволіць не толькі не стаць ахвярамі чужых геапалітычных інтарэсаў, але і ўпэўнена адказаць на новыя агрэсіўныя выклікі палітычных і іншых авантурыстаў.


1. *Арон, Р.* Мир и война между народами / Р. Арон. – М. : NOTA BENE, 2000. – 880 с.

2. *Дугин, А. Г.* Философия войны / А. Г. Дугин. – М. : Яуза, 2004. – 256 с.

3. *Клаузевиц, К.* О войне : в 2 т. / К. Клаузевиц. – М. : Воениздат, 2002. – Т. 1. – 340 с.

4. *Лоренц, К.* Агрессия (так называемое «зло») / К. Лоренц. – М. : Издательская группа «Прогресс», 1994. – 272 с.

5. *Тоффлер, Э.* Война и антивойна: Что такое война и как с ней бороться. Как выжить на рассвете XXI века / Э. Тоффлер. – М. : АСТ : Транзиткнига, 2005. – 412 с.

6. *Фукуяма, Ф.* Конец истории и последний человек / Ф. Фукуяма. – М. : АСТ : ЗАО НПП «Ермак», 2004. – 588 с.

7. *Шарп, Дж.* От диктатуры к демократии. Стратегия и тактика освобождения / Дж. Шарп. – М. : Новое издательство, 2012. – 84 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ